***Лойша Т. В.****, настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 41 імя А. М. Кузняцова г. Гродна*

## Мы — частка роднай краіны
## Класная гадзіна для III–IV класаў

***Мэта:*** актуалізацыя ведаў вучняў пра Беларусь, пра малую радзіму.

***Задачы:***

•пашырыць уяўленні вучняў аб роднай краіне, яе сімвалах, прыродзе і гісторыі, славутых мясцінах;

•развіваць пазнавальную актыўнасць;

•выхоўваць любоў да Радзімы, гонар за родны край.

***Форма:*** вусны часопіс.

**1. Арганізацыйны этап. Стварэнне станоўчага настрою.**

— Добры дзень усім! Сёння на вуліцы свеціць цёплае сонейка. Я яго трошкі пазычыла ў неба і прынесла ў клас. Няхай свеціць нам, каб было ярка і светла на душы і тварах.

Вывешвае выяву сонейка.

— Усе мы жывём на планеце Зямля. Гэта дом для ўсіх нас. Каб зберагчы гэты вялікі дом, неабходна палюбіць невялічкую яго частку, якую называюць Радзімай.

**2. Мэтавызначэнне.**

— Белая Русь… Зямля пад белымі крыламі… Так паэтычна называюць нашу Радзіму.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына,
Жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,

Як неба, сонца і зару.

Твая зямля, твая Радзіма

Названа светла — Беларусь.

— Сёння мы пашырым свае ўяўленні пра родную краіну, яе сімвалы, прыроду і гісторыю, славутыя мясціны, звернем увагу і на трагічныя бакі лёсу роднага краю, пагаворым пра тое, што павінен ведаць кожны, нават самы маленькі грамадзянін нашай краіны.

— Таму запрашаю вас пагартаць старонкі вуснага часопіса, які я для вас падрыхтавала. Вы гатовы? Тады ўвага!

**3. Асноўная частка.**

**Першая старонка часопіса «Афіцыйная сімволіка Рэспублікі Беларусь»**

— Паглядзіце інсцэніроўку і падумайце, якія назвы атрымалі сыны.

Нарадзіліся ў маці тры сыны. Кажа яна першаму: «Цябе, сынок, буду прасіць, каб насіў маю карону. Я спляла яе з жытняга калосся, канюшыны, ільну, якімі квітнее наша зямля». А затым дае сыну чырвоную зорачку. «Беражы яе і глядзі, каб ніколі-ніколі не патухла гэта зорка, бо з ёю ў сэрцы змагаўся наш народ за вольнае жыццё, за сонечнае неба».

«Ты, сынок, — кажа маці другому, — насі адзенне, па якім усе будуць пазнаваць нашу багатую і мужную зямлю». І дала сыну чырвона-зялёна-белую вопратку.

«А ты, сынку, птах мой галасісты, будзеш спяваць маю самую любімую, дарагую песню», — папрасіла маці трэцяга сына і падарыла яму ноты і словы песні.

Задумалася маці: а якія ж імёны даць сваім сынам? Вы здагадаліся? (Адказы вучняў.)

А потым яшчэ раз звярнулася да сваіх дзяцей: «Ты, сынок першы, будзеш вядомы ў нашай дзяржаве пад іменем Герб; ты, сынок другі, будзеш называцца

Сцягам, а ты, сынок трэці, — Гімнам». Так і жывуць у маці тры сыны: Герб, Сцяг, Гімн.

— А хто іх маці, як яе называюць? *(Рэспубліка Беларусь.)*

— Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны гімн — гэта твар нашай краіны, які адрознівае яе ад іншых краін свету. Кожны год у другую нядзелю мая адзначаецца Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

— Паглядзіце на выявы герба і сцяга над дошкай.

— Колькі колераў мае Дзяржаўны сцяг?

— Якімі кветкамі пераплецены Дзяржаўны герб?

— Што сімвалізуе чырвоная зорка на Дзяржаўным гербе?

— Што надрукавана на стужцы, якой абвіты Дзяржаўны герб?

— Як трэба сябе паводзіць падчас выканання гімна? *(Пры выкананні гімна людзі ўстаюць, мужчыны здымаюць галаўныя ўборы, ніхто не размаўляе. Так праяўляецца павага да краіны.)*

— Давайце і мы выкажам павагу да нашай краіны.

Гучыць Дзяржаўны гімн (вучні спяваюць).

**Другая старонка часопіса**

**«Белы бусел — сімвал Беларусі»**

— Сімвалам нашай краіны з'яўляецца белы бусел. Народнае павер'е сцвярджае, што бусел прыносіць у дом поспех, дзяцей і шчасце.

Да нас паданні з даўніны дайшлі,
І помню, мне не раз казала маці,
Што там, дзе пасяліліся буслы, —
І мір, і дабрабыт заўсёды ў хаце…

З вобразам бусла звязана шмат прыкмет. Якія прыкметы вы ведаеце?

1. Калі бачылі бусла першы раз вясной у палёце, лічылі за добрую прыкмету: увесь год будзеш «лётаць», будзеш здаровы.

2. Гняздо бусла на даху хаты — шчаслівая прыкметы. Яно засцерагае хату ад маланкі і пажару, ад граду, ад злых чар і духаў, спрыяе прыбытку ў гаспадарцы і ўзбагачэнню гаспадара.

3. Лічылася, што бусел прыносіць шчасце, а калі разбурыць яго гняздо ці забіць птушанят, то ён пачынае помсціць. У гэтых выпадках ён нібы прыносіць і кідае ў двор атрутных змей ці нават спальвае хату, прыносячы падпаленую галавешку і кідаючы яе на дах.

4. Знайсці і захаваць пяро бусла — да поспеху ва ўсім.

— А яшчэ па палёце бусла можна даведацца пра заўтрашняе надвор’е. Калі бачыш, што ляціць бусел, трэба казаць: «Бусел-калода, што заўтра будзе — дождж або пагода?» Калі крылы бусла прамыя ў палёце, то заўтра будзе добрае, яснае надвор’е, калі ж бусел махае крыламі, то будзе дождж.

— Давайце ўявім, што мы гэтыя велічныя птушкі, якія лунаюць над неабсяжнымі прасторамі нашай Радзімы і любуюцца яе прыгажосцю. Яны ўзлятаюць высока-высока ў блакітнае неба. Раскажыце, што вы бачыце? Як выглядае наша Беларусь з вышыні птушынага палёту? (Адказы вучняў.)

— Паглядзіце, бусел прынёс вам паштоўку з пажаданнямі. Прачытайце яе.



***Дарагія мае сябры!***

*Жадаю вам моцнага здароўя, творчага натхнення, поспехаў у вучобе, вялікай адказнасці за лёс сваёй радзімы. Хачу, каб вы з гонарам неслі званні «грамадзянін» і «патрыёт».*

— Спадзяюся, што бусліка мы не падвядзём.

**Трэцяя старонка вуснага часопіса**

**«Прырода роднага краю»**

— Паглядзіце на карту Беларусі. Наша краіна нагадвае зялёны лісток на планеце Зямля. Яна багата лясамі, якія займаюць трэцюю частку тэрыторыі Беларусі. Наша краіна багата лугамі і балотамі, азёрамі, якіх больш за 10 тысяч, рэкамі і рачулкамі, якіх больш 20 тысяч.

— Якія самыя буйныя рэкі Беларусі? *(Дняпро, Нёман, Прыпяць, Сож, Заходняя Дзвіна.)*

— Якія птушкі жывуць каля вады ці на вадзе? *(Качкі, гусі, чайкі і інш.)*

— Якую рыбу можна злавіць у нашых вадаёмах? *(Плотка, акунь, лешч і інш.)*

— Беларусам, а значыць, нам, пашанцавала на прыгажосць і непаўторнасць краявідаў. Як сапраўдныя грамадзяне і патрыёты, мы павінны берагчы прыроду. Яна жывая. Калі парушыць гэтае жыццё, то можа здарыцца бяда.

— «Прырода — наша багацце», «Беражыце лес ад агню», «Не засмечвайце рэкі» — такія надпісы мы бачым, калі адпачываем на прыродзе. Як вы думаеце, аб чым нас папярэджваюць?

— Уявім, што мы з вамі знаходзімся ў лесе. Адпачываем на палянцы, бегаем, гуляем. Прыйшоў час збірацца дадому. Раскажыце пра свае дзеянні. (Адказы вучняў.)

— Сапраўды, патрэбна пакідаць сваё месца чыстым, каб і прыродзе дыхалася лягчэй і свяжэй.

**Чацвёртая старонка**

**«Гісторыка-культурная спадчына Беларусі»**

— Беларусь размешчана ў цэнтры Еўропы. Яна мяжуе з пяццю дзяржавамі: Расіяй, Украінай, Польшчай, Латвіяй і Літвой.

— Хто назаве сталіцу Рэспублікі Беларусь? *(Мінск.)*

— На колькі абласцей падзелена наша краіна?

— У якой вобласці жывём мы?

— Гродна займае асаблівае месца сярод культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. У горадзе вельмі шмат славутых мясцін і пабудоў. Запрашаю ўсіх на завочную экскурсію з нашымі юнымі экскурсаводамі. Вось наш маршрут:




— Пачнём з плошчы Савецкай.

*Гэта касцёл Святога Францыска Ксаверыя. Яго яшчэ называюць фарным што азначае «галоўны». Касцёл пабудаваны ў 1703 годзе, з’яўляецца помнікам архітэктуры. Гэта адзін з найбуйнейшых і найпрыгажэйшых касцёлаў Беларусі. У мінулым ён быў кляштарам езуітаў, самых багатых у Рэчы Паспалітай.*

— Хто быў у гэтым касцёле? Што вам запомнілася?

*На плошчы Савецкай знаходзіцца Драматычны тэатр. Створаны ў верасні 1947 года на аснове трупы Бабруйскага абласнога драматычнага тэатра, які ў той час быў пераведзены ў Гродна. Адкрыўся тэатр 20 кастрычніка 1947 года.*

*У 1984 годзе для тэатра пабудаваны новы будынак з цэглы і зборнага жалезабетону: вялікая зала з амфітэатрам і балконам на 700 месцаў, вестыбюлем і фае і адміністрацыйны корпус з малой залай на 216 месцаў на першым паверсе.*

*Над уваходам размешчана трохфігурная скульптурная кампазіцыя, у аснове якой — крылаты Пегас.*

— Крочым да гродзенскіх замкаў.

*Стары замак — гэта адно з самых старажытных гістарычных збудаванняў у Беларусі, ён узнік як умацаванае паселішча. Замак быў пабудаваны ў канцы 11 стагоддзя.*

*Палічыце, колькі ўжо стагоддзяў Старому замку?*

*Новы замак — гэта каралеўскі палац, збудаваны ў сярэдзіне 18 стагоддзя ў стылі барока. У адной частцы знаходзяцца каралеўскія пакоі, а ў другім баку — памяшканні для пасяджэнняў.*

— Запрашаем вас у Каложскі парк, *дзе знаходзіцца важны архітэктурны помнік — царква Святых Барыса і Глеба. Яе таксама называюць «Каложская». Храм пабудаваны ў 1183.*

*Неўміручая Каложа — гэта святы дом, які заўсёды адчыняе свае дзверы. Тут адчуваецца ўпэўненасць, абарона, ахова. Яна атуляе духоўнай цеплынёй. Каложа — гэта крынічка з жывой вадой. Назва Каложа паходзіць ад слова «коложань», што азначае месца, дзе б'е ключык з вадой.*

*Каложскі храм лічыцца сэрцам горада, бо час над ім не падуладны.*

— А цяпер накіруемся ў парк Жылібера.

*Названы так у гонар вядомага біёлага, батаніка і медыка, які заснаваў у Гродне яшчэ ў XVIII стагоддзі і батанічны сад, і Медыцынскую акадэмію — Жана Эмануэля Жылібера.*

*Сённяшні парк значна адрозніваецца ад свайго папярэдніка, закладзенага вядомым французскім навукоўцам, але таксама ўражвае зялёнымі алеямі, лаўкамі, што размясціліся ў цені высокіх дрэў, мастамі, над якімі цурчыць рэчка Гараднічанка, і бронзавымі статуямі. Сярод іх дзяўчына, падобная да русалкі, задуменна сядзіць на палянцы, у яе валасах заблыталася рыба.*

— Пройдзем крыху далей і заўважым вельмі рэдкую для Беларусі царкву — лютэранскую кірху, якая была ўзведзена ў 1783 годзе.

*Храм з'яўляецца месцам не толькі рэлігійнага, але і культурнага значэння. Канцэрты арганнай і класічнай музыкі збіраюць шматлікіх прыхільнікаў.*

— Мы ганарымся гісторыяй Гродна, нашай малой радзімы, і павінны старацца рабіць усё, каб з кожным годам любімы горад станавіўся больш утульным, прыгожым, квітнеючым.

**Пятая старонка часопіса**

**«Ішла вайна народная...»**

— 8 мая 1945 года германскае камандаванне капітулявала, а ўвечары 9 мая ў Маскве прагрымеў першы святочны салют — у гонар перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Захопленая, але не скароная Беларусь стала сімвалам усенароднай барацьбы з ворагам, сімвалам мужнасці і гераізму.

Асаблівай мужнасцю вызначыліся абаронцы Брэсцкай крэпасці, якая першай прыняла ўдар ворага. Больш за месяц воіны без вады і ежы, амаль без боепрыпасаў, без медыкаментаў працягвалі змагацца з ворагам да апошняга абаронца.

Ва ўсім свеце вядома аб трагедыі вёскі Хатынь. Мемарыяльны комплекс Хатынь — гэта светлая і вечная памяць аб тых, хто заслужыў найбольшае права жыць, але каго ўжо няма з намі. У цэнтры мемарыяла ўзвышаецца бронзавая скульптура Нескаронага Чалавека — чалавека, які вынес на сваіх плячах усе нягоды вайны, які ўстаў жывым з агню. Боль і гнеў, смутак і помста выяўлены на твары яго. А рукі, нагружаныя сялянскія рукі, гаротна і асцярожна трымаюць цела закатаванага дзіцяці. І здаецца, бронзавыя вусны Нескаронага кажуць «Будзь пракляты, фашызм!».

У горадзе Гродна ў парку Жылібера ў 1949 годзе быў адкрыты мемарыяльны комплекс — брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. У 1984 годзе ў падножжа манумента быў запалены Вечны агонь. Як наша вечная памяць тым, хто падарыў нам мірнае неба і шчаслівую будучыню.

— Я таксама запалю «вечны агонь» у нашым класе.

Настаўнік вывешвае выяву вечнага агню на дошку або уключае электронную свечку. У памяць аб загінуўшых аб'яўляецца хвіліна маўчання.

— Якія пажаданні вам хацелася б выказаць, загортваючы старонку часопіса «Ішла вайна народная»?

Выказванні вучняў.

**4. Рэфлексія.**

— Вось і перагарнулі мы апошнюю старонку вуснага часопіса, які даў нам магчымасць яшчэ раз зразумець, што мы жывём у цудоўнай і непаўторнай, багатай краіне. Кожны з нас павінен задаць сабе пытанне: як я пражыву год, каб не было сорамна ні мне, ні маёй сям’і, каб я з гонарам мог сказаць: «Я — грамадзянін Беларусі»? Што я зраблю для сваёй адзінай Айчыны? На сардэчках напішыце свой запланаваны ўчынак і ўпрыгожце ім нашу краіну.

**5. Заключнае слова.**

— Няхай шчаслівай будзе зямля пад белымі буслінымі крыламі, наша з вамі зямля! І мы, грамадзяне Беларусі, будзем ганарыцца тым, што жывём у мірным, прыгожым краі, што мы — частка роднай краіны.